**Галіна Флікоп-Світа**

# Алтарныя крціны Грека-каталіцкіх цэркваў Беларусі (XVIII – пачатку XIX ст.): іканаграфічны рэпертуар і атрыбуцыя захаваных помнікаў

Даследаванне праведзена на аснове гістарычных крыніц XVIII – пачатку XIX ст. з шэрагу архіваў Беларусі і замежжа. Узноўлены іканаграфічны рэпертуар: сабраны звесткі пра найбольш пашыраныя выявы, выяўлены прыклады рэдкіх сюжэтаў. Прааналізаваны захаваныя помнікі, для некаторых з іх устаноўлена гісторыя напісання, высветлены звесткі пра жывапісца, выяўлены іканаграфічныя крыніцы.

*Ключавыя словы:* алтарны жывапіс, Грэка-каталіцкая царква, уніяцкая царква, беларускае сакральнае мастацтва

**Галина Флікоп-Світа**

**Вівтарні картини Греко-католицьких церков Білорусі (XVIII – початку XIX ст.): іконографічний репертуар і атрибуція захованих пам’яток**

Дослідження проведено на основі історичних джерел XVIII початку XIX ст. із низки архівів Білорусі та закордону. Відновлено іконографічний репертуар: зібрано відомості про найпоширеніші зображення, наведено приклади рідкісних сюжетів. Проаналізовано збережені пам’ятки, щодо деяких із них встановлено історію створення, висвітлено відомості про автора, з’ясовано іконографічні джерела.

*Ключові слова*: вівтарний живопис, Греко-католицька церква, уніатська церква, білоруське сакральне мистецтво

Паступовае ўкараненне ва ўніяцкую практыку прысценных алтароў паўплывала не толькі на трансфармацыю храмавых інтэр’ераў, але і на ўзбагачэнне сюжэтнага і іканаграфічнага рэпертуару ўніяцкага жывапісу. Гэта тлумачыцца тым, што алтары, у адрозненні ад іканастасаў, не былі абмежаваны пэўнай праграмай. Таму ў алтарах маглі змяшчацца разнастайныя выявы, а не толькі абразы Багародзіцы, Ісуса Хрыста, Апосталаў, Прарокаў, Праайцоў і сюжэты царкоўных святаў.

Асобнае даследаванне, прысвечанае сюжэтнаму рэпертуару алтарнага жывапісу Беларусі, дагэтуль не праводзілася. Разам з тым, захаваныя помнікі з уніяцкіх і каталіцкіх прысценных алтароў, якія знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі РБ (далей – НММ РБ), былі прадстаўлены на тэматычнай выставе “Алтарны жывапіс Беларусі XVIII – XIX ст.” ў 2009 г. [1]. Натуральна, што шэраг твораў рэпрадукаваўся ў спецыялізаваных выданнях, прысвечаных сакральнаму мастацтву [2], а таксама падлягаў разгляду ў навуковых публікацыях па гэтай жа праблематыцы [3–12]. Разам з тым, дагэтуль не была ўзноўлена максімальна поўная карціна, якая б дала ўяўленне пра ўсё багацце сюжэтаў і вобразаў алтарнага жывапісу грэка-каталіцкіх цэркваў Беларусі.

Для даследавання гэтага пытання неабходным з’яўляецца зварот да гістарычных крыніц. Гэта тлумачыцца тым, што пры скасаванні Уніі абразы, якія не адпаве-

далі ўсходняму абраду, з колішніх уніяцкіх цэркваў былі прыбраны (прададзены ў каталіцкія касцёлы, знішчаны або перапісаны). А гэта азначае, што большасць алтарных карцін у выніку гэтых працэсаў была страчана. Да сённяшняга часу захаваліся пераважна іконы "нейтральных" сюжэтаў: тыя творы, на якіх прадстаўлены агульнахрысціянскія святыя або эпізоды з жыцця Ісуса Хрыста і Багародзіцы. Натуральна, што гэтая спадчына стварае далёка няпоўнае ўяўленне пра іканаграфічны рэпертуар алтарнага жывапісу ўніяцкіх храмаў.

А на падставе візітацыйных актаў можна скласці разгорнуты спіс папулярных алтарных выяў, якія сустракаліся ў большасці цэркваў і зафіксаваны ў розныя перыяды існавання разглядаемай канфесіі і ў розных рэгіёнах. Гэта, у сваю чаргу, дасць разуменне таго, хто быў найбольш шанаваным сярод святых у нашых продкаў-уніятаў. А ўжо гэта дапаможа асэнсаваць глыбінныя рэлігійныя "патрэбы" тагачасных людзей, бо кожны са святых з'яўляся для іх заступнікам у пэўнай галіне дзейнасці і сферы жыцця. Менавіта гэтым і тлумачыцца актуальнасць дадзенага даследавання.

Намі апрацавана было каля шасці тысяч візітацыйных актаў, якія даюць уяўленне пра стан прыблізна 2000 цэркваў за розныя гады (па шэрагу цэркваў маецца па некалькі дакументаў). У спісе выкарыстанай літатуры і крыніц намі будуць прыведзены толькі тыя архіўныя справы, цытаты ці непасрэдныя звесткі з якіх былі ўзяты для артыкула. Разам з тым, нашыя абагульненні, датычныя найбольш пашыраных ці, наадварот, рэдкіх сюжэтаў, зроблены на падставе вялікага пласту матэрыялу.

Безумоўна, самае вялікае распаўсюджанне атрымалі абразы Багародзіцы ў шматлікіх іканаграфічных тыпах і зводах. Такія выявы найчасцей згадваюцца ў візітацыйных актах, а захаваны шэраг твораў таксама пацвярджае думку пра багацце багародзічнай іканаграфіі. Некаторыя з аспектаў гэтай праблематыкі мы ўжо закраналі раней у нашых артыкулах [13], а ўвогуле паўнавартаснае вывучэнне ўсіх захаваных багародзічных абразоў з уніяцкіх цэркваў яшчэ плануецца ажыццявіць. Таму гэты аспект у артыкуле закрануты не будзе.

Тут жа мы засяродзімся на іншых сюжэтах алтарнага жывапісу. Прывядзём найбольш тыповыя, а таксама прыгадаем рэдкія, унікальныя выявы. У артыкуле будуць разгледжаны некаторыя з захаваных помнікаў. Натуральна, што не ўяўляецца магчымым прывесці тут усе вядомыя нам творы алтарнага мастацтва грэка-каталіцкай Царквы. Абраны для разгляду будуць тыя абразы, пра якія ўдалося адшукаць цікавыя звесткі датычныя аўтарства, іканаграфічнай крыніцы, гісторыі напісання і г. д.

Мяркуючы па звестках з пратаколаў праверак цэркваў, у XVIII – першай трэці XIX ст. пашырэнне мелі наступныя вобразы: Ісус Хрыстос (у розных варыянтах іканаграфіі); далей прыводзім пералік у алфавітнай паслядоўнасці, а не ў залежнасці ад частатотнасці ўжывання: Св. Антоній Падуанскі, Св. Ануфрый Пустэльнік, Св. Варвара, Св. Васіль Вялікі, Св. Іосіф, Св. Мікалай, Св. Міхаіл Арханёл, Св. Параскева, Св. Пётр і Павел (парныя выявы і адзіночныя), Св. Юрый-Змеяборац, Св. Ян Евангеліст, Св. Ян Непамук, Св. Ян Хрысціцель. Гэта найбольш папулярныя выявы алтарных карцін.

З шматфігурных сюжэтных кампазіцый, якія адпавядаюць пэўным эпізодам з Бібліі, найчасцей у алтарах знаходзіліся "Дабравесце Божай Маці", "Пераўтварэнне

Божае”, “Узнясенне”, “Укрыжаванне”, “Успенне”, “Узвядзенне Крыжа”, “Уваскрэсенне” (амаль ва ўсіх рэгіёнах, за выключэннем Тураўскага афіцыялату Турава-Пінскай епархіі). Шырока былі прадстаўлены алегарычныя выявы Дзевы Марыі: “Каранаванне Божай Маці”, “Апека Божай Маці”, “Беззаганнае Пачацце”, “Божая Маці Смуткуючая”. А таксама вельмі распаўсюджанай сярод алтарных карцін была “Троіца Новазапаветная”.



*Іл. 1. Абраз “Пакроў”; дошка, тэмпера; 126,5×76×2 см; з Пакроўскай царквы ў г. Маладзечна Мінскай вобл.; 1751 г. Фота Д. М. Казлова. НММ РБ*

Шэдэўрамі, відавочна, алтарнага жывапісу Беларусі з’яўляюцца два помнікі 1751 г., якія паступілі ў НММ РБ з царквы Пакрова Божай Маці г. Маладзечна Мінскай вобласці (*іл. 1*), дзе яны захоўваліся на званіцы [14, іл. 109, 112]. Гэтая акалічнасць дае падставы сумнявацца ў іх першапачатковай прыналежнасці да маладзечанскай царквы, бо ў савецкі перыяд часта здаралася, што пры закрыцці пэўнага храма ягоная маёмасць перавозілася ў суседні, дзе захоўвалася на гарышчы ці на званіцы (а не ў інтэр’еры царквы, дзе звычайна бракавала месца для размяшчэння прыбыўшага комплекса). Сюжэты гэтых абразоў – “Св. Мікалай” і “Пакроў” з’яўляюцца надзвычай пашыранымі ва ўніяцтве і ў пераважнай большасці цэркваў знаходзіліся менавіта такія выявы [15]. У візітах непасрэдна маладзечанскай царквы, пачынаючы з 1752 г. пры апісанні алтароў згадваюцца іконы разглядаемых сюжэтаў. Абраз “Пакроў” знаходзіўся ў галоўным алтары, што адпавядала і тытулу храма (у візіце за 1752 г. гаворка ідзе пра царкву Св. Троіцы, у дакументах за 1793, 1799 гг. – пра Пакроўскую, з апісанняў можна прыйсці да высновы, што гэта адзін



*Іл. 2. Абраз "Апека Божай Маці"; дошка, тэмпера; 123,5×81,5×2 см; з Успенскай царквы в. Бусяж Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл.; 1797 г. Фота Д. М. Казлова. НММ РБ*

той царкоўны будынак, проста на нейкім этапе храм быў пераасвечаны). Выява Св. Мікалая была ў адным з бакавых алтароў. Цікава адзначыць, што на 1734 г. інтэр'ер царквы выглядаў па-іншаму: там яшчэ быў іканастас, а ў алтарах былі выявы іншых сюжэтаў [16, арк. 10–18]. Няма сумневу, што адбыліся істотныя змены ў храме паміж 1734 і 1752 гг., якія прывялі да поўнага пераабсталявання інтэр'еру. Паказальна, што ў гэты перыяд і былі напісаны разглядаемыя абразы.

Прыкладам уніяцкага алтарнага твору зводу "Божая Маці Апека", які быў больш папулярным за выяву "Пакроў" [17], з'яўляецца выдатны датаваны помнік 1797 г. з вёскі Бусяж Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці (*іл. 2*) [14, іл. 137]. Па гэтай царкве нам вядома толькі візіта за 1784 г., у ёй, дарэчы, таксама згадваецца абраз адпаведнага сюжэту, аднак відавочна, што гаворка ідзе пра іншы твор, бо захаваны помнік мае надпіс з больш позняй датай. На той час у храме не было іканастаса, а размяшчаліся толькі прысценныя алтары [18, арк. 6–26 адв.]. Няма сумневу, што і разглядаемы твор быў напісаны менавіта для алтара. Верагодна, гэты абраз з'яўляецца спісам невядомай цудадзейнай іконы такой жа іканаграфіі, бо на ім Багародзіца прадстаўлена быццам бы ў шаце і над ёй "прымацаваны" воты у выглядзе сэрцаў. Відавочна, што на абраз, які паслужыў першаўзорам, была ўскладзена шата, якая закрывала вопратку Багародзіцы, і дзве воты. Аўтар бусяжскага твора на сваю жывапісную дошку так гэта і перамаляваў.

Папулярнымі сярод уніяцкага алтарнага жывапісу з'яўляюцца абразы з выявай Юрыя-Змеяборца. Яскравым прыкладам можа служыць падпісны по-



*Іл. 3. Абраз "Юрый-Змеяборац", мастак Нікадзім Пранчыцкі; палатно, алей; 120×100 см; з Юраўскай царквы манастыра ў Жыровічах Слонімскага р-на Гродзенскай вобл.; 1750 г. Фота М. П. Мельнікава. МСБК*

мнік з Юраўскай царквы Жыровіцкага манастыра, выкананы мастаком Нікадзімам Пранчыцкім у 1750 г. (*іл. 3*) [19, с. 105]. Няма сумневаў, што гэты твор займаў галоўнае сакральнае месца ў названым храме. У візітацыйных актах жыровіцкага манастыра згадваецца некалькі капліц, адна з якіх і была асвечана ў гонар названага святога. У ёй меўся толькі адзін алтар, выкананы ў тэхніцы ілюзорнага жывапісу [20, арк. 39]. У гэтых дакументах пры апісанні алтара абраз не згадваецца, аднак няма сумневаў, што твор Нікадзіма Пранчыцкага з'яўляецца ўзорам менавіта алтарнага ўніяцкага жывапісу.

Надзвычай каштоўныя археаграфічныя матэрыялы з Вены (Аўстрыя) дазволілі ўстанавіць асобу мастака. Так, у візітацыях базыльянскіх кляштараў за 1751–1755 гг. вельмі падрабязна прыведзены асабовы склад (пры гэтым, на жаль, звестак пра інтэр'еры цэркваў тут няма). У дакументах па жыровіцкім манастыры за 1752, 1753, 1754, 1755 гг. сярод іншых згадваецца і Nicodemus Pronczynski pictor (на лацінскай мове жывапісец) [21, арк. 146 адв., 254, 361 адв., 451]. Няма сумневу, што гэта той жа чалавек, які падпісаўся на абразе як "Нікодимъ Прончицкїй". У гэтым жа дакуменце ўказваецца, што ў жыровіцкім манастыры ён знаходзіцца з 1747 г. На жаль, іншых звестак пра яго няма. Аднак у любым выпадку нават гэтыя сціплыя дадзеныя праліваюць святло, бо з іх вынікае, што стваральнік названага твора быў айцом-базыльянінам, які пэўны час знаходзіўся ў Жыровічах.

У МСБК маецца яшчэ адзін помнік з жыровіцкага манастыра, які пісаўся ва ўніяцкі перыяд – вялікага памеру абраз з выявай Св. Мікалая [19, с. 133]. У дадзеным выпадку няма сумневаў, што гэты твор з'яўляецца ўзорам менавіта алтарнага жывапісу, бо такая велічыня была ўласціва алтарным палотнам. З гістарычных крыніц вядома, што на пачатак XIX ст. у адным з бакавых алтароў галоўнага храма жыровіцкага




*Іл. 4. Абраз “Укрыжаванне з перадстаяннем Марыі-Магдаліны”; палатно, алей; 160×88 см; з манастыра в. Ляды Смалявіцкага р-на Мінскай вобл.; канец XVIII ст. Фота М. П. Мельнікава. МСБК*

манастыра знаходзіўся абраз “Св. Мікалай”, напісаны на палатне [20, арк. 2–2 адв.; 22, арк. 2–2 адв.]. У візіце за 1823 г. указаны нават яго памеры: 2 локці 17 цаляў [23, арк. 2–2 адв.]. Локаць – адзінка вымярэння ВКЛ, якая раўняецца прыблізна 65 см; цаля раўнялася ў той перыяд 2,4 см. Атрымліваецца, што памеры зафіксаванага ў візіце абраза Св. Мікалая пры пераводзе іх у метрычныя адзінкі складаюць каля 170 см; а памеры вышэй згаданага помніка, які цяпер захоўваецца ў МСБК – 173 см. Такім чынам, няма сумневу, што гэта цэнтральны абраз трох’яруснага алтара, які знаходзіўся ў храме справа ад галоўнага.

Прыкладам яшчэ аднаго пашыранага сюжэта для ўніяцкіх алтароў з’яўляецца “Укрыжаванне” з манастыра ў Лядах (Смалявіцкі раён Мінскай вобласці) (*іл. 4*), якое датуецца канцом XVIII ст. [19, с. 181]. Пры апісанні алтара ў правай капліцы храма ў візіце за 1809 г. згадваецца твор адпаведнага сюжэту [24, арк. 75 адв.–76], а ў візіце за 1824 г. акрамя таго прыводзіцца памер – два локці з чвэрцю на адзін локаць з чвэрцю, і адзначаецца наяўнасць срэбнага цярновага вянка (на галаве ўкрыжаванага Хрыста) [25, арк. 2–4]. Гэтыя характарыстыкі адпавядаюць і разглядаемаму захаванаму твору.

У алтары левага нефа Сафійскага сабора ў г. Полацку таксама змяшчалася выява такога ж сюжэту [26, с. 27]. Праўда, тут яна была выканана як сценапіс. Полацкае

“Укрыжаванне” паводле іканаграфіі з’яўляецца больш тыповым для ўніяцкага іканапісу: тут ля ўкрыжаванага Ісуса Хрыста паўстаюць Божая Маці і Апостал Ян, у адрозненне ад помніка з Лядаў, дзе кленчыць ля крыжа Марыя-Магдаліна. Выявы з ёю таксама сустракаліся ў грэка-каталіцкім жывапісе, аднак былі не настолькі пашыранымі.

А “Укрыжаванне”, дзе ля Распятага Хрыста моляцца і кленчаць Дзева Марыя, Апостал Ян і Марыя-Магдаліна, захавалася ў колішнім уніяцкім алтары царквы Св. Мікалая а. г. Кажан-Гарадок Лунінецкага раёна. Гэты твор дае ўяўленне пра яшчэ адзін варыянт іканаграфіі на разглядаемы сюжэт [26, с. 29]. Цікава адзначыць, што сярод помнікаў беларускага іканапісу вядомы ўзоры і іншых кампазіцый. Так, напрыклад, помнік з в. Чарнякава Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці (*іл. 5*), які захоўваецца ў НММ РБ, таксама як і кажан-гарадоцкі твор уключае ў кампазіцыю тых жа персанажаў [1].



*Іл. 5. Абраз “Укрыжаванне з перадстаячымі”; дрэва, тэмпера; 124×112,5 см; з Мікалаеўскай царквы в. Чарнякава Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл.; пачатак XIX ст. Фота Д. М. Казлова. НММ РБ*



*6. Абраз "Святы Ануфрый з жыціем", дошка, тэмпера, пазалота; 148×93 см; з царквы Святога Ануфрыя вёскі Хацілаў Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл.; сярэдзіна XVIII ст. Фота Д. М. Казлова. НММ РБ*

Аднак яны закампанаваны па-іншаму, а пад крыжом напісана выява пелікана. Пелікан – адзіная птушка, якая ў выпадку неабходнасці можа карміць птушанят сваім мясам. З гэтай прычыны названая птушка стала адным з сімвалаў хрысціянства, бо сімвалізуе сабой ахвярную сутнасць Хрыста. Разглядаемы твор з в. Чарнякова датуецца пачаткам XIX ст. Няма сумневаў, што гэты твор прызначаўся для алтара.

Адным з найбольш шануемых ва ўніяцтве святых быў Св. Ануфрый Пустэльнік. Да нашага часу захавалася некалькі твораў такога сюжэту, выкананых для беларускіх грэка-каталіцкіх цэркваў у XVIII ст. Сярод іх маецца і ўнікальны жыційны абраз з в. Хацілаў Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці, які захоўваецца ў НММ РБ (*іл. 6*). Як адзначыў А. А. Ярашэвіч, верагодна, абраз паходзіць з могільнікавай капліцы Св. Ануфрыя ў названым паселішчы [1]. Твор датаваны сярэдзінай XVIII ст. Адзначым, што ў візіце за 1759 г. капліца ў Хацілаве не згадваецца, апісваецца толькі прыходская царква, у якой тады, дарэчы, абраза на такі сюжэт яшчэ не было [27, с. 200–201]. Верагодна, пазней, калі была збудавана капліца, для яе спецыяльна быў выкананы гэты алтарны абраз з выявай патранальнага святога.

Красамоўным прыкладам колішняй алтарнай уніяцкай карціны можа з'яўляцца абраз "Іосіф з маленькім Хрыстом" з Пакроўскай царквы в. Дзеткавічы Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці (*іл. 7*) [19, с. 184]. У дадзеным выпадку цікавасць выклікае і сам сюжэт, і яго іканаграфія. Што датычыцца першага аспекту, то трэба адзначыць, што ва ўніяцкім тагачасным алтарным жывапісе, як і ў каталіцкім, выявы "Іосіфа з



*Іл. 7. Абраз "Св. Іосіф";
палатно, алей; 93×72 см;
з Пакроўскай царквы в. Дзеткавічы
Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл.;
XVIII ст.
Фота М. П. Мельнікава. МСБК*




*Іл. 8. Мастак Аляксандр Тарасевіч,
гравюра "Св. Іосіф"; медзярыт; каля 1670 г.*

маленькім Хрыстом" атрымалі дастатковае распаўсюджанне. А адносна іканаграфіі трэба сказаць, што на розных творах яна істотна адрозніваецца – агульным з'яўляецца толькі склад персанажаў. А для разглядаемага твора нам удалося ўстанавіць іканаграфічную першакрыніцу. Ёю з'яўляецца гравюра вядомага тагачаснага мастака і гравёра Аляксандра Тарасевіча (*іл. 8*), якая была выканана паводле заказу базыльянаў [28, с. 188–189]. Такім чынам, друкаваны адбітак, выкананы для патрэбаў уніяцкай царквы, быў выкарыстаны іканапісцам для напісання абраза ў алтар грэка-каталіцкага храма.

Сярод агульнахрысціянскіх святых, якія шырока шанаваліся ў грэка-каталіцкай царкве, варта таксама назваць Св. Варвару, Св. Параскеву, Св. Пятра і Паўла і Міхаіла Арханёла. А акрамя выяў агульнахрысціянскіх святых, у алтарах грэка-каталіцкіх цэркваў вельмі часта змяшчаліся выявы ўласна каталіцкіх святых. Сярод іх да найбольш шануемых ва ўніяцтве асоб належыць Св. Антоній Падуанскі. Менавіта алтарныя карціны з яго выявай існавалі ў храмах большасці рэгіёнаў. Так, у Лідскім дэканаце, паводле звестак 1792 г., амаль у кожнай царкве ў адным з бакавых алтароў знаходзілася выява названага святога [29, арк. 1–43]. А ў Навагрудскім дэканаце ў 1754 г. колькасць яго абразоў перавышала колькасць ікон Св. Мікалая [30]. Атрымаць уяўленне пра абраз Св. Антонія Падуанскага можна дзякуючы палатну з царквы Арханёла Міхаіла в. Мірацічы Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці, якое цяпер захоўваецца ў НММ РБ [1]. Твор мае надпіс з датай 1744 г. Відавочна, што менавіта

гэты абраз фігуруе ў візітах за 1754 і 1798 гг. [30, арк. 46; 31, с. 222]. У той час ён размяшчаўся ў адным з бакавых алтароў.

Іншы цудоўны прыклад алтарнай карціны такога сюжэта паходзіць з колішняй базыльянскай царквы ў Барунах (Ашмянскі раён Гродзенскай вобласці) (*іл. 9*), цяпер захоўваецца ў МСБК [19, с. 95]. Гэты твор мае надпіс з датай 1738 г. Звяртае на сябе ўвагу, што абодва прыведзеныя помнікі выкананы паводле агульнай першакрыніцы (ці адзін з іх з'яўляецца першаўзорам для другога, што менш верагодна). На абодвух творах ідэнтычнымі з'яўляецца размяшчэнне постацяў, іх ракурсы і жэсты, чырвоная і зялёная драпіроўкі, нават галінка лілеі з кветкамі на абодвух творах аднолькавая.

Значнае пашырэнне атрымалі выявы Язафата Кунцэвіча – адзінага "ўласна ўніяцкага" Святога, пакутніка за грэка-каталіцкую веру [32]. Нельга сказаць, што яго абразы былі ў кожнай царкве, разам з тым, у некаторых рэгіёнах яны сустракаліся ў большасці храмаў. У прыватнасці гэта датычыцца заходніх дэканатаў Кіеўскай архіепархіі. А вось найменш выявы Язафата Кунцэвіча былі прадстаўлены ў Тураўскім афіцыялаце Турава-Пінскай епархіі, мала іх было і ў Брэсцкім афіцыялаце Уладзіміра-Брэсцкай епархіі.




*9. Абраз "Св. Антоній Падуанскі"; палатно, алей; 110×72 см; з пабазыльянскай царквы (цяпер касцёл Св. Пятра і Паўла) у в. Баруны Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл., 1738 г. Фота М. П. Мельнікава. МСБК*

Да нашага часу таксама дайшлі і адзінкавыя ўніяцкія алтары з аўтэнтычнымі абразамі. Былыя алтары (а цяпер – ківоты) у царкве Пераўтварэння Божага ў в. Порплішча захоўваюць цудоўныя жывапісныя творы канца XVII – XVIII ст.: "Св. Радня", "Троіца Новазапаветная", "Укрыжаванне Хрыстова", "Св. Мікалай" [26, с. 29]. Пра два апошнія сюжэты, іх пашырэнне ў алтарным уніяцкім жыва-

пісе гаворка вялася вышэй. Асобна трэба сказаць пра кампазіцыю “Троіца Новазапаветная”. Яе цікавасць для нашага даследавання палягае ў тым, што порплішскі помнік дае ўяўленне пра адзін з самых пашыраных сярод уніяцкага алтарнага жывапісу сюжэтаў. Бадай, амаль у кожнай грэка-каталіцкай царкве ў XVIII – пачатку XIX ст. знаходзіўся твор такой кампазіцыі. Жывапісных дошак і палотнаў з такой выявай у музейных зборах краіны захавалася таксама не мала, аднак не заўсёды дакладна вядома гісторыя гэтых помнікаў, а таму не ва ўсіх выпадках з дакладнасцю можна разглядаць як уніяцкую алтарную спадчыну. Хаця, безумоўна, большасць менавіта да яе і належыць.

Іншы цікавы помнік з гэтага храма – алтарная карціна “Ганна навучае Марыю”. Нельга назваць гэты сюжэт вельмі рэдкім, бо акрамя порплішскага помніка вядома каля дзясятку ўніяцкіх твораў у музейных зборах краіны, дзе прадстаўлена такая кампазіцыя. Хаця і надта пашыраным яго таксама не назавеш. Пераважна захаваныя творы паходзяць з Віцебшчыны і Гродзеншчыны. У візітах цэркваў з гэтых мясцін таксама такія выявы згадваюцца часцей, чым у храмах іншых рэгіёнаў [26, с. 29].

Яшчэ адным прыкладам алтарнай карціны на такі сюжэт, якая размешчана ў колішнім грэка-каталіцкім алтары, з’яўляецца помнік у пабазыльянскай царкве Пераўтварэння Божага ў Ракаве Валожынскага раёна Мінскай вобласці. Акрамя згаданых, “родныя” абразы захаваліся ў некаторых з бакавых алтароў храмаў у Барунах, Дзівіне, Новай Мышы, Кажан-Гарадку, пра што ў адным з нашых артыкулаў вялася гаворка [26].

Алтарны жывапіс уніяцкай царквы быў прадстаўлены і ўнікальнымі,назвычай рэдкімі сюжэтамі. Так, пры апісанні левага бакавога алтара ў царкве Св. Мікалая г. Віцебска ў 1822 г. згадваецца абраз на сюжэт “Перанясенне мошчаў Св. Мікалая” (*іл. 10*) (ён знаходзіўся над галоўным абразом алтара з выявай Св. Мікалая). Сярод згадак у архіўных крыніцах – гэта адзіная, дзе размова ідзе пра такую выяву [33, арк. 20 адв.]. Захаваных помнікаў беларускага мастацтва на такі сюжэт таксама няма. Аднак не выклікае сумневаў, што менавіта гэты абраз яшчэ ў пачатку XX ст. зацікавіў даследчыкаў беларускай даўніны, а таму быў зафіксаваны на тагачасных здымках. М. Шчакаціхін указвае, што ў Віцебскае сховішча старажытнасцяў помнік паступіў з царквы Увядзення Багародзіцы ў храм [34, с. 82]. Адсюль вынікае, што туды творы патрапілі з Мікалаеўскай віцебскай царквы пасля яе разбурэння. Цяперашняе месца знаходжання твора не вядома, аднак фотавыявы, якія надрукаваны з тагачасных негатываў і захоўваюцца ў НГМ РБ, даюць уяўленне пра яго [35].

Да ліку алтарных карцін на рэдкія сюжэты, кампазіцыі якіх былі распрацаваны паводле жадання заказчыка, належаць два помнікі з в. Шчорсы Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці. Яны былі заказаны ў пачатку XIX ст. Іакімам Храптовічам у італьянскага жывапісца Марчэла Бачарэллі, які на той час жыў і працаваў у Варшаве. Адно з гэтых палотнаў захавалася да нашага часу і знаходзіцца ў Нацыянальным музеі ў Варшаве, другое было страчана ў часы Першай Сусветнай вайны, аднак да таго часу яно было апублікавана, а таму яго выгляд вядомы па старых здымках [36].

Аднак найбольшую цікавасць выклікаюць некалькі прыкладаў іншага характару. З гістарычных крыніц вядома, што ва ўніяцкіх алтарах часам змяшчаліся выявы праваслаўных святых. Так, у храме в. Дудзічы Блонскага дэканату ў 1732 г. у бакавым



*Іл. 10. Абраз “Перанясенне мошчаў Св. Мікалая ў Бар”; з г. Віцебска, XVIII ст. Фотаздымак пачатку XX ст. Фота ў НГМ РБ, абраз страчаны*

алтары знаходзіўся абраз, напісаны на палатне, Антонія Пячорскага [37, арк. 15 адв.]. Дарэчы трэба адзначыць, што гэта ўвогуле адзіная выява такога сюжэту, зафіксаваная ў гістарычных крыніцах. У Ільінскім храме в. Цяпіна Чашніцкага дэканату (Чашніцкі раён Віцебскай вобласці) у адпаведнай канструкцыі размяшчалася ікона Святой Іаанны [38, арк. 45].

Абраз “Феадосія і Еўдакія” (на палатне) знаходзіўся ў алтары храма Пераўтварэння Божага г. Віцебска ў 1822 г. [33, арк. 16]. Пры чым вышэй названая парная выява відавочна з’яўлялася новай, бо царква, дзе яна знаходзілася, узводзілася ў 1813–1820 гг. Па ўсёй верагоднасці, для Пераўтварэнскай царквы яна спецыяльна і набывалася, а не была прынесена з іншага храма. Святая Феадосія шануецца і ў праваслаўі і ў каталіцтве. А вось Св. Еўдакія выключна праваслаўная святая.

У канцы XVIII – пачатку XIX ст. у некалькіх цэрквах розных дэканатаў размяшчаліся іконы Святых Барыса і Глеба. Так, на 1799 і 1823 гг. у храме Св. Апосталаў Пятра і Паўла в. Гняздзілаў у адным з бакавых алтароў былі такія выявы [39, арк. 220, 223]. Пры апісанні царквы ў Астрашыцкім Гарадку ў 1811 г. візітатар нават прыводзіць удакладненне адносна гэтых святых: “рускія княжычы” [40, арк. 1 адв.]. Іх выява ў гэтым храме размяшчалася ў адным з бакавых алтароў. Абраз тых жа святых знаходзіўся на 1806 г. уверсе правага алтара ў царкве Пераўтварэння Божага в. Вілейка Барысаўскага

дэканату (Докшыцкі раён Віцебскай вобласці) [41, арк. 9–9 адв.]. Цікава, што Святыя Барыс і Глеб у візітах часам згадваліся пад іх імёнамі, атрыманымі пры хрышчэнні – Раман і Давід. Напрыклад, у той жа справе па Барысаўскім дэканаце за 1806 г. візітатар пры апісанні царквы Сашэсця Св. Духа ў мястэчку Беразіно (Бярэзінскі раён Мінскай вобласці) адзначае наяўнасць у левым бакавым алтары выявы Святых Рамана і Давіда [41, арк. 45].

Такім чынам, вывучэнне алтарнага жывапісу ўніяцкіх храмаў паказала, што сюжэты тут былі як тыповыя для прысценных алтароў, так і "нечаканыя", прадстаўленыя выявамі Святых, кананізаваных праваслаўнай царквой. Да ліку апошніх належаць Святыя Барыс і Глеб, Св. Еўдакія, Св. Антоній Пячорскі. Безумоўна, гэта чарговы раз гаворыць пра сінтэз традыцый у рэчышчы грэка-каталіцтва. Увогуле пры прыцягненні пратаколаў візітацый удалося рэканструяваць сюжэтны рэпертуар грэка-каталіцкага алтарнага жывапісу. Былі вызначаны самыя распаўсюджаныя выявы, якія меліся ў алтарах пераважнай большасці цэркваў. Падкрэслім, што захаваныя помнікі далёка не поўнай ступені адлюстроўваюць рэальную сітуацыю, якая панавала ў часы існавання Уніі. Прыведзеныя вышэй прыклады алтарных карцін з'яўляюцца рэдкімі нешматлікімі выпадкамі, калі да нашага часу захаваліся або алтары з аўтэнтычнымі выявамі або самі абразы, пра якія дакладна вядома, што яны пісаліся менавіта для алтароў.

Аднак, як ужо было сказана вышэй, захаваныя помнікі не адлюстроўваюць да канца сітуацыю з сюжэтамі алтарных карцін, бо вялікая колькасць твораў была страчана. А перш за ўсё былі знішчаны абразы, на якіх увасабляліся Святыя, кананізаваныя каталіцкай царквой. На падставе звестак з пратаколаў праверак нам удалося высветліць, што ў прысценных алтарах грэка-каталіцкіх цэркваў у жывапісным увасабленні знаходзіліся: Андрэй Баболя, Антоній Падуанскі, Бенедыкт Нурсійскі, Бернард з Клерво, Бернардзін Сіенскі, Брыгіта Шведская, Вінцэнт Ферэр, Дамінік, Іосіф Каласанц, Казімір, Карл Барамей, Кацярына Сіенская, Каэтан, Папа Рымскі Рыгор, Разалія, Рох, Станіслаў Біскуп, Станіслаў Костка, Тамаш Аквінскі, Тарэза Авільская, Францішак Асізскі, Францішак Ксаверый, Францішка Рымская, Ян Непамук. Найбольш пашыранымі з пералічаных святых былі выявы Антонія Падуанскага, Яна Непамука, Францішка Асізскага.

1. Алтарны жывапіс Беларусі XVIII–XIX стагоддзяў: віртуальная версія выставы ў Нацыянальным мастацкім музеі 23 лютага – 10 чэрвеня 2009 г. / аўтар уступу А. А. Ярашэвіч. Мінск: Нац. маст. музей, 2009.

2. Иконопись и алтарная живопись Беларуси XII–XVIII веков / авт. текста и сост. Н. Ф. Высоцкая. Мінск: Беларусь, 2012. 231 с.: ил.

3. Ярашэвіч А. А. Вобраз Святога Мікалая ў старажытнабеларускім мастацтве // Наша вера. 2002. № 4(45).

4. Ярашэвіч А. А. Арханёлы над Беларуссю // Наша вера. 2003. № 3.

5. Ярашэвіч А. А. "…Ты Пётр – скала…": Постаць святога Пятра ў старажытна беларускім мастацтве // Наша вера. 2005. № 2(32).

6. Ярашэвіч А. А. "…І пачула голас…": сюжэты звеставання ў беларускім мастацтве // Наша вера. 2000. № 1.

7. Ярашэвіч А. А. Унебаўшэсце Пана // Наша вера. 2005. № 1.

8. Ярашэвіч А. А. Унебаўзятая // Наша вера. 2000. № 3.

9. Ярашэвіч А. А. Крыжовы шлях Хрыста ў беларускім мастацтве // Наша вера. 2004. № 1.

10. Ярашэвіч А. А. Сюжэт Уваскрэсення ў старабеларускім мастацтве // Наша вера. 2001. № 1.

11. Ярашэвіч А. А. Беззаганнае зачацце // Наша вера. 2004. № 4.

12. Ярашэвіч А. А. "І напоўніліся ўсе Духам Святым": Сюжэты Спаслання Святога Духа і Тройца ў старажытнабеларускім мастацтве // Наша вера. 2000. № 2.

13. Флікоп Г. А. Беларускія ўніяцкія абразы Божай Маці "невядомай іканаграфіі": да пытання ўстанаўлення зводу // Беларускі гістарычны часопіс. 2014. № 3. С. 23–37.

14. Іканапіс Беларусі XV–XVIII стагоддзяў / аўтар тэксту і складальнік Н. Ф. Высоцкая. Мінск: Беларусь, 2001.

15. Піскун Ю. А. Аб змесце і аўтарстве маладзечанскіх абразоў "Пакровы" і "Мікола" // Помнікі мастацкай культуры Беларусі: новыя даследаванні: [зб. артыкулаў] / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; [рэд. С. В. Марцэлеў]. Мінск: "Навука і тэхніка", 1989. С. 34–40.

16. Львівська національна наукова бібліотека України ім. В. Стефаника. Ф. 6. Спр. 244.

17. Карэлін У., Мельнікаў М. Асаблівасці ізводаў Пакроў і Апёка на Брэстчыне // Волинська ікона: дослідження та реставрація: наук. зб. Луцьк: Надстир'я, 2003. Вип. 10: матеріали Х Міжнар. наук. конф. з волинського іконопису, м. Луцьк, 17–19 вересня 2003 р. С. 64–68.

18. Lietuvos valstybes istorijos archyvas (LVIA). F. 634. Ap. 1. B. 53.

19. Флікоп-Світа Г. А. Беларускі іканапіс XVI – першай паловы XX ст.: альбом. Мінск: Беларуская навука, 2019. 365 с.: іл.

20. Санкт-Петербургский институт истории Российской академии наук (СПбИИ РАН), архив. Ф. 52. Оп. 1. Д. 291.

21. Österreichische Nationalbibliothek. Nr. 3848.

22. СПбИИ РАН, архив. Ф. 52. Оп. 1. Д. 289.

23. СПбИИ РАН, архив. Ф. 52. Оп. 1. Д. 374.

24. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродна. Ф. 1621. Воп. 1. Спр. 5.

25. Российский государственный исторический архив (РГИА). Ф. 824. Оп. 2. Д. 163.

26. Флікоп-Світа Г. А. Прысценныя алтары ўніяцкіх храмаў Беларусі ў канцы XVII – пачатку XIX ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2016. № 3. Мінск, 2016. С. 26–37.

27. LVIA. F. 634. Ap. 1. B. 48.

28. Степовик Д. В. Українська гравюра бароко. Київ: Видавництво "КЛІО", 2012. С. 188–189.

29. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41244. Арк. 1–43.

30. НГАБ. Ф. 1502. Воп. 1. Спр. 13.

31. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при Управлении Виленского учебного округа. Вильно: тип. А. Г. Сыркина, 1904. Т. 14. С. 222.

32. Хадыка А. Святы Язафат Кунцэвіч: складанне культу і іканаграфіі ў Беларусі // Наша вера. 2006. № 2(36).

33. НГАБ. Ф. 1781. Воп. 26. Спр. 1410.

34. Высоцкая Н. Ф., Яніцкая М. М. Беларускія творы мастацтва, якія зніклі ў віхуры Другой сусветнай вайны // Вяртанне – 2: артыкулы, дакументы і архіўныя матэрыялы па праблемах пошукаў і вяртання нацыянальных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь / Беларус. Фонд культуры. Мінск, 1994.

35. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь (НГМ РБ). Інв. №: НД 33297/23.

36. Флікоп-Світа Г. А. Барацьба за выяву Бога: лёс алтарных карцін царквы ў в. Шчорсы Навагрудскага павета пасля скасавання Уніі // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт.; вып. 15 / рэдкал.: В. Ф. Голубеў [і інш.]. Мінск: НГАБ, 2017. С. 294–304.

37. РГИА. Ф. 823. Оп. 3. Д. 518.

38. РГИА. Ф. 824. Оп. 2. Д. 187.

39. Lietuvos mokslu akademijos biblioteka. Рукапісны аддзел. F. 41. Sygn. 107–212.

40. НГМ РБ. Інв. №: НД 10974.

41. НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41254. Арк. 9–9 адв.